Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

ДУМКА ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6)
Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвае даражэй. Пераменa адрэсу 30 гр.

Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата ганарараў залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош, сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок петыту ў 1 шпальту

№ 6 Вільня, Субота 21-га студзеня 1928 г. Год I

По загаду Камісара Ураду на м. Вільню сканфіскаваны № 5 „Думкі Працы за перадавіцу: „Наш адказ“ і карэспандэнцыю: „Няхай жыве асьвета ў роднай мове“!

Падаючы гэтую вестку да ведама нашых чытачоў, мы ня можам моўчкі прайсьці міма яе.

Падобныя канфіскаты, ужо не ў пяршыню, ня толькі не даюць беларускай радыкальнай прэсе магчымасьці высьветліць угадовую, здрадніцкую ролю Сель-Саюзу ў выбарнай кампаніі, але навет і даць адказ на яўна-правакацыйныя прапазіцыі „Сялянскай Нівы“ па нашаму адрасу.

У канфіскаванай перадавіцы мы далі толькі ясны і выразны адказ правакацыйным прапазіцыям „Сялянскай Нівы“. Больш нічога ў ёй ня было. Гэту канфіскату цяжка інакш зразумець, як жаданьне зрабіць нам немагчымым усялякую барацьбу ў масах з замаскаванаю угодай. Ня гледзячы на гэта, у будучым нумары мы зноў пастараемся вярнуцца да гэтай тэмы. Што да канфіскаты карэспандэнцыі „Няхай жыве асьвета ў роднай мове“!—дык лічым лішнім гутарыць аб ёй. Загаловак гэтай карэспандэнцыі гаворыць ужо сам за сябе.

Мы можам толькі горача пратэставаць супроць канфіскаты № 5 „Думкі Працы, спадзяючыся, што суд ухіліць яе з прычыны адсутнасьці праўных падстаў для яе.

Два лягэры.

Для кожнага, навет павярхоўнага наглядальніка, пры паглядзе на выбарную шахоўніцу становіцца ясным, што тут ідзе перадусім барацьба дзьвёх сілаў, двох лягэраў. З аднаго боку—ідэалёгічна яскрава выражаны буржуазны кірунак і ўсялякага роду і адценяў ягоныя прысьпешнікі, падгалоскі, агенты, прытарнаваныя да настрояў мас; з другога боку — ясны і выразны сялянска-работніцкі фронт.

Гэтак сама стаіць справа і ў нас на Заходняй Беларусі, ня гледзячы на тое, што тут выступае на арэну і мамэнт нацыянальны, да пэўнай меры ўскладняючы сітуацыю, робячы яе на першы пагляд менш выразнай і празрыстай. Аднак і тут ня трудна ўгледзець гэты разьдзел.

Польская буржуазія ўсіх кірункаў выразна аб'ядналася навакол „санацыйнай“ праграмы ўраду. Забанкрутаваўшая на вёсцы П. П. С., як у цэлай Польшчы, гэтак сама і ў нас, іграе сярод спольшчанага работніцтва гарадоў сваю ролю падгалоскаў і агентаў Пілсудчыны і вядзе змаганьне не на жыцьцё, а на сьмерць з ППС—лявіцай і лявіцай Праф. Саюзаў.

Інакш крыху ў гэтым адношаньні стаіць справа на беларускім груньце.

Яскрава выражаным фашыстаўскім кірункам зьяўляюцца тут групы Паўлюкевіча і Умястоўскага.

Ролю-ж *падгалоскаў агентаў* фашыстаўскай буржуазіі ўзялі на сябе, аб'ектыўна кажучы, дзьве родные сабе групы Сель-Саюз з Хадэкамі або буржуазны блёк меншасьцяў і „санаваны“ (аздароўлены) ад скампрамітаванай дэфэнзыўна-даносчыцкай шайкі Сель-Саюз пад новай фірмай „Сялянскай Партыі“ Я. Станкевіча (аб ей была гутарка ў папярэднім несканфіскаваным нумары).

Узятую на сябе ролю агентаў фашызму сярод беларускіх працоўных масаў—асабліва заўзята пачалі выконваць Ярэмічы, Рагулі і Станкевічы. Нядаўныя прынцыповыя працоўнікі сялянска-работніцкага фронту, каб падыйсьці, уцерціся ў давера да беларускіх працоўных масаў, абвясьцілі сябе староньнікамі і змагарамі за сялянска-работніцкі ўрад.

Выпісаўшы для атуманеньня беларускіх працоўных масаў на сваім сьцягу „барацьбу за сялянска-работніцкі ўрад“, гэтыя паны з падвоенай энэргіяй узяліся за агідную *правакатарскую* работу разьбіваньня еднасьці, салідарнасьці, працоўных масаў, нацкоўваючы беларускіх сялян і работнікаў супроць польскіх самымі агіднымі і брыднымі спосабамі. Як прыклад гэтага, можа хоць-бы паслужыць факт абвінавачньня павадыроў польскага сялянска-работніцкага руху ў разьбіцьці і разгроме Грамады, у пасаджэньні яе павадыроў за краты—да чаго яны самы ў першую чаргу прыкладвалі і прылажылі руку.

Гэтак, выставіўшы на сваім сьцягу „сялянска-работніцкі ўрад“ гэтыя правакатары імкнуцца разьбіць самую аснову яго зьдзейсьненьня—салідарнасьць працоўных масаў усіх нацыянальнасьцяў. Іх належнасьць да блеку з жыдоўскай і нямецкай буржуазіяй не прыпадковая. Ня гледзячы на ўсю стараннасьць, з якой Сельсаюзьнікі і К-о выконваюць сваю ролю агентаў-правакатараў (бо запраўды толькі гэтак можна назваць іх ролю—Р э д.),—фашыстаўская буржуазія неасабліва давярае пасьпеху іх акцыі, з прычыны поўнай іх скампрамітаванасьці, як яўных агентаў-даносчыкаў (прыклад: хоць-бы даносы на Луцкевіча—Р э д.).

Дзеля гэтага яна ўсю сваю стаўку паставіла на разьбіцьце, дэзарганізацыю беларускага сялянска-работніцкага лягэру. Пагрозы, абяцанкі праз падсыльных агентаў пасыпаліся на павадыроў беларускага сялянска-работніцкага руху. Пачалося тэрарызаваньне з-за вугла. У абставінах гэткага тэрору і, як вынік яго, імкнуцца паўстаць яшчэ новыя, нявыразныя дагэтуль групы „інтэлігенцыі“, якія, ня маючы уласных сілаў, імкнуцца спэкуляваць імем арыштаваных паслоў.

Гэтак фашыстаўская буржуазія ўсімі спосабамі імкнецца да маральнага абезглаўленьня беларускага сялянска-работніцкага руху. Усімі сіламі і спосабамі, праз каго толькі можна і дасцца, стараецца яна вырваць з гэтага руху паслоў.

Плян сьмелы! Стараньні, аднак, дарэмны. Мы пэўны, што паслы, якія дагэтуль моцна трымаліся сялянска-работніцкай ідэалёгіі, якія за гэта аказаліся за кратамі, ніколі не пераменяць сваіх перакананьняў.

Гэтак выглядае дачасны абраз змаганьня дзьвёх сілаў. У нашай-жа перамозе мы пэўны.

Спэкуляцыя імем б. паслоў

Надыйшлі весткі, што пэўныя асобы разаслалі на правінцыю людзей для зьбіраньня падпісоў на лісту, на якой нібы маюць фігураваць б. паслы. Гэтым засьцерагаем сялян і работнікаў, што гэта ні больш, ні менш, як спэкуляцыя імяньнямі папулярных дзеячоў.

Міжнародныя пасьпехі Польшчы і унутранае палажэньне краю.

У сваей вялікай палітычнай прамове на банкеце „Таварыства Дасьледчыкаў Міжнародных Справаў“ польскі міністар заграшічных справаў сьцьвердзіў вялікія пасьпехі Польшчы ў мінулым годзе ў галіне міжнароднай палітыкі; пасьпехі, якія значна ўзмоцнілі вонкавае палажэньне Польшчы ў сьвеце, „паднясьлі яе аўтарытэт сярод іншых дзяржаваў і г. д.

П. Міністар тонка даў зразумець, што ўсё гэта зроблена выключна ўрадам у новых варунках новага рэжыму—узмоцненай выканаўчай улады і фактычнай поўнай адсутнасьці парляманту...

Праўда, у іншых дэмакратычных краёх, якраз наадварот—уся сіла ўраду, асабліва ў справах міжнароднай палітыкі,—у становучай, рашаючай волі народнага прадстаўніцтва, на якое можа абаперціся ўрад у сваей заграшічнай палітыцы...

Але з другога боку, гэтая апора ўраду ў парляманьце трэбуе заўсёды згоды і згоднасьці паміж урадам і парлямантам, трэбуе кантролю ўрадавай палітыкі з боку народнага прадстаўніцтва... А, як ведама, і ў гэтым пануючы ў Польшчы рэжым рашуча разыходзіцца з дэмакратыямі Заходу.

Польскі ўрад амаль-што ня ўвесь год працаваў без парляманту, трымаючы апошні толькі ў характары нейкага „канстытуцыйнага прыбору“, ці арнамэнту, а ў другое паўгодзьдзе дык навет ня скліваючы яго фактычна цалкам...

Гэткім чынам,—народнае прадстаўніцтва, а праз яго народ (у пэўнай меры) былі зусім адсунуты ад усялякага ўдзелу ў уплывах на дзяржаўнае жыцьцё Польшчы...

Калі на гэты бясспрэчны факт паглядзець, як на пэўную справу, ці дасьлед, ці як кажуць,—„экспэрымэнт“, дык ясна, што з гэтага дасьледу трэба зрабіць зусім ясныя вывады, гэты экспэрымэнт бясспрэчна павінен нешта даказаць.

Хто сачыў за заявамі і прамовамі сяброў сучаснага ўраду ў Польшчы, той ведае, што гэты экспэрымэнт быццам якраз плянова і ўмысна робіцца, каб нешта даказаць — так сказаць,—наглядным, навучальным, нараўнаўчым спосабам...

Сьпярша ў Польшчы была зроблена спроба парлямантарызму, зроблены экспэрымэнт, як кажуць цяпер Сеймаўладзтва. Спроба гэтая прывяла, як даводзяць цяпер—амаль не да катастрофы... Цяпер робіцца—проста—процілежны, адваротны экспэрымэнт — „ўрадаўладзтва“, навет зусім бяз Сойму...

Рэзультаты гэтага экспэрымэнту і падлічае цяпер зацікаўленая старана.

Вось дзеля чаго банкетавая прамова п. Міністра замежных спраў мае зусім асаблівае значэньне...

П. Міністар Залескі—пэўне-ж—у згодзе з усім урадам марш. Пілсудскага — робіць быццам канчальныя вывады з гэтага экспэрымэнту гадовага ўрадаваньня ў Польшчы бяз Сойму—падлічае рэзультаты гэтай гадовай спробы—у сваей галіне — у галіне міжнароднага становішча Польшчы і яе „вонкавага аўтарытэту і сілы“.

Рэзультаты гэтыя, паказвае нам 117 міністар,—надзвычай, нячувана, навет — неспадзевана дадатнія, памысныя, карысныя для Польшчы...

Польскі ўрад зрабіў вельмі многа для консалідацыі Польшчы на міжнародавым груньце. Гэтым, зразумела, дадатна рэклямуюцца і так званыя „ўрадовыя лісты“ кандыдатаў... у парлямант... Але вось толькі нейк — шэльмуецца самая ідэя, самая сутнасьць парляманту,—гэтым усім—адкідаецца нейк—самая патрэба, карыснасьць, сэнс самага існаваньня парляманту ў Польшчы...

І трэба сказаць рашуча, што ў значнай меры „прадвыбарная прамова польскага міністра замежных справаў, рэклямуючая ўрад і ўрадавыя лісты для выбараў у парлямант,—падкопывае, кампрамітуе сэнс і патрэбу гэтых—выбараў, даводзячы з фактамі ў руках—па меншай меры—непатрэбнасьць, калі навет ня шкоднасьць, самага парляманту ў Польшчы... А ўкосна даводзячы, — што няшкодным будзе ў Польшчы толькі такі парлямант, які будзе толькі „адабрэньнем“ сучаснага ўраду... але — і гэта не даводзіць усё-ж—патрэбы выбараў...

Але трэба паглядзець на справу і крыху глыбей.

Мы ня маем тутака запярэчваць — ані фактаў, ані іх тлумачаньня — у мове п. міністра. Прызнаем навет пасьпехі „беспарляманцкага“ польскага ўраду ў галіне вонкавай палітыкі...

Але-ж народна-дзяржаўнае жыцьцё вялікага краю не абмяжоўваецца яго вонкава-палітычнымі актамі і пасьпехамі, якія, як мы ведаем з гісторыі апошніх часоў, — без запраўдных глыбокіх і ўсебаковых пасьпехаў унутры—народнага жыцьця, заўсёды аказваліся нятрывалымі...

Вонкава-палітычная консалідацыя—без консалідацыі ўнутры гаспадарчай, народна-грамадзкай — ня можа ўтрымацца больш-менш доўгі час...

І вось пасьля прыгожай прамовы міністра аб вонкавых трыумфах Польшчы на міжнародным полі—паўстае пытаньне: ці гэтымі аднымі трыумфамі ўжо даказана польская ўрадавая тэза—аб карыснасьці, амаль-што—неабходнасьці для Польшчы беспарляманцкага рэжыму...

Другі прадстаўнік ураду павінен быў бы таксама сьцьвердзіць суадказныя пасьпехі беспарляманцкай Польшчы і ў галіне — яе гаспадарчага разьвіцьця і дабрабыту, узросту грамадзкай і палітычнай сьвядомасьці і актыўнасьці яе насяленьня, яго ўсялякай арганізаванасьці, яго маральнага, духоўнага ўздыму, без якіх ня можа цяпер ані водзін народ, ані водная дзяржава пасьпешна трывала канкураваць з іншымі на міжнароднай арэне.

Мы ня будзем тутака цалком адказваць на ўсе паўстаючыя пры гэтым пытаньні і сумлівы...

Укажам толькі—на тыя небясьпекі, які цягне за сабою, як свае неабходныя насьледзтвы,—гэткае безпарляманцкае, безнароднае ўрадаваньне выканаўчай улады; пасьледзтвы, якія ў сваім далейшым разьвіцьці—могуць прывясьці да скасаваньня ўсіх вонкава палітычных пасьпехаў Польшчы...

Адсунуўшы народ ад учасьця ў жыцьці дзяржавы, кожны ўрад зараз-жа ўпадае ў спакусу—запамінаць аб справе, аб інтарэсах народу...

Дык калі навет можна сьцьвердзіць пэўныя пасьпехі польскага ўраду і ў галіне фінансава-гаспадарчай, дык і тут гэтыя пасьпехі—або цалком залежаць ад тое-ж заграніцы, як дадзеная Польшчы пазыка, або абмяжоўваюцца маючымі валадаючымі клясамі, інтарэсы якіх няўхільна робяцца бліжэйшымі да такога ўраду, засьцігаючы ад яго інтарэсы і дабрабыт шырокіх народных масаў... І запраўды-ж—побач з пэўнымі пасьпехамі ў галіне фінансаў і ў разьвіцьці прамысловасьці ў Польшчы, як сьцьвярджаюць работніцкія і сялянскія газэты, ідзе ўсьцяж паўпэрызацыя шырокіх працоўных масаў...—гэткім чынам—загнаная ў кут, прыкрытая ў ім дыплёматычнымі, міжнароднымі пасьпехамі беспарляманцкага, безнароднага ўрадаваньня, праўда народна-дзяржаўнага жыцьця, вылязае з гэтага кута з іншага боку—пагрозай унутранай катастрофы краю пры ўсіх вонкавых пасьпехах дзяржавы...

Такой адзнакай якраз навет фінансава-гаспадарчага нездароўя Польшчы—навет пры яе фінансава-пазыковых пасьпехах—(як стабілізацыі яе валюты, гарантаванай замежным капіталам, але ня ўнутранымі гаспадарчымі сіламі краю) — зьяўляецца зьявішча ўсьцяж узрастаючай дарагоўлі... Дарагоўля гэта, як разумее кожны, як быццам скасоўвае зьнізу ўсё тое, што робіцца для фінансава-гаспадарчай стабілізацыі краю ўрадам зьверху...

Дарагоўля, значыць, як быццам — падкопывае самы фундамэнт народна гаспадарчага а адсюль і — грамадзка-палітычнага жыцьця краю...

Як бачым, тая „тэза“—аб дасканальных пасьпехах безнароднай і наднароднай улады—ў яе працы на агульную карысьць дзяржавы і тым самым—народу; тэза, якую быццам хоча даказаць сучасны ўрад, рашуча пярэчыць сама сабе з боку зусім неспадзяванага.

Сьцьверджаныя ў газэтах факты ўзросту дарагоўлі — настолькі ўжо паграджаюць гаспадарчай і ўсялякай „стабілізацыі“ ў краі, што сам урад—усьцяж заяўляе, што будзе весьці рашучую барацьбу з грозным для ўсей яго працы зьявішчам...

Але, як сьцьвярджае „Роботнік“, апрача гэтых заяваў, урад ня толькі нічога ня робіць дзеля барацьбы з дарагоўляй, але навет—„сам урад робіць гэтую дарагоўлю“. (Robot. 11/XII 27г.). Так пьвердзіць і даводзіць з лічбамі і фактамі ў руках газэта—ў цэлым радзе паважных артыкулаў сваіх найлепшых спэцыялістаў, як гр. Зарэмба і інш...

Пасьля ўсяго, што сказана вышэй, гэты факт, сьцьверджаньне работніцкай прэсай, зьяўляецца — ня толькі зразумелым, але і няўхільным...

Факты ўзросту дарагоўлі залішне яркія і жудасныя, нат' на іх і ня зьвернуць увагі... Але, як бачым, апрача гэтай „плятанічнай“ бо чамусьці — бяссільнай — увагі, улада, урадуючая без учасьця народу, яго працоўных масаў, нічога зрабіць ня можа...

Мы навет—ня кажам: ня хоча, як цьвердзіць гэта выразна і рашуча ўся польская работніцкая і сялянская апазыцыйная прэса... Ня можа — таму, што „вызваліўшыся“ ад сувязі ці ад залежнасьці ад шырокіх народных масаў, якія як ніяк павінны быць прад-

стаўлены ў парляманьце, улада ў Польшчы зараз-жа папала ў поўную залежнасьць каб не сказаць — у палон ад іншых групаў і клясаў краю — маючых, валадаючых, — эксплёатуючых народныя працоўныя масы. Бо ж — нідзе ніколі ня можа існаваць нейкая абсалютна „надклясавая“, улада: наадварот — улада павінна апірацца на тыя, ці іншыя клясы насяленьня...

На каго апіраецца сучасная ўлада ў Польшчы, гэтага навет зусім ня ўкрываюць цяпер яе прыхільнікі... гэта ведама ды від на ўсім...

У заключэньне падамо некалькі фактаў і лічбаў узросту дарагоўлі ў Польшчы.

Дарагоўля жыцьця ў Польшчы за апошнія два гады ўзрасла на 54 проц. гэта значыць—больш як у паўтара раза...

Цэны на прадукты першай патрэбы ў Польшчы ўжо ня толькі дарасьлі да заграічных, так-званых „сьветавых“, але на некаторыя тавары і прадукты значна перарасьлі апошнія. Але вось — плата работнікам і іншым працаўнікам (урадоўцам і іншым)— у Польшчы—значна ніжэй, як — усюды за граніцай. А напрыклад — у параўнаньні з Амэрыкай, дык ніжэй амаль ня ў 10 разоў...

Калі ўзрост цэнаў у краі на такія прадукты, як хлеб і інш., будзе павялічвацца надалей, дык ясна, што — ад усе „добрай гаспадарчай каньюнктуры“, якая створана ў значнай меры таннасьцяй работніцкіх платаў — у месьце і на вёсцы — пры дарагоўлі прадуктаў — фабрычных і сельска гаспадарчых—павінен прыйсьці канец.

Які канец, аб гэтым хай добра падумае той урад, які пераконаны ў тым, што — без народу можна рабіць гэты народ шчасьлівым — трымаючы яго бяз хлеба, але за гэта кормячы пасьпехамі на міжнародным полі...

Францускі фінансіст — аб гаспадарчым дабрабыце Нямеччыны.

У паважнай францускай часопісі ведамы эканаміст Пэркель дае абраз гаспадарчага стану Нямеччыны.

Пасьпехі Нямеччыны ў гаспадарчай адбудове краю ў 1927 г. францускі эканаміст называе папросту—патворнымі.

Прадукцыйная здольнасьць мэталургічнай, хімічнай, вугальнай і інш. галінаў прамысловасьці—перавышала значна даваенную роўню. Тарговы абарот краю з заменжнымі рынкамі — ўсьцяж узрастаў без перарыву. Бюджэтныя даходы далі паўмільярда марак (залатых) перавышкі. Безрабоцьце — зьменшылася напалову — ў параўнаньні з 1926 г. Валюта стабілізавана канчальна, маючы залатое пакрыцьце, значна перавышаючае норму.

Побач з значнымі дыплёматычнымі пасьпехамі, Нямеччына заключыла ў мінулым годзе цэлы сьцяг тарговых трактатаў, адчыняючых для яе прамысловых тавараў замежныя рынкі. Але прамысловы ўрост Нямеччыны расьце так хутка, што і цяпер усьцяж нямецкая дыплёматыя і тарговая агентура заняты справай—пашырэньня сеці гаспадарчых трактатаў Нямеччыны з іншымі краямі.

Гэтым, як ведама, і тлумачыцца ў значнай меры тая хуткасьць, з якой немцы пайшлі на паразуменьне з Польшчай, касуючы стан „гаспадарчай вайны“ з ей, існаваўшы амаль ня тры гады...

З свайго боку, Польшча таксама „выказала шмат добрай волі“—асабліва пад рашучым націскам амэрыканскага капіталу, які— ад гэтага эканамічнага паразуменьня Польшчы з Нямеччынай—узалежніў сваю назыку польскаму ўраду...

Як ведама, дальназоркія немцы згары абмясьлілі ўсю сваю акцыю адносна Польшчы. Яны здабылі вялізарныя пазыкі ў Амэрыцы, якія ўлажылі ў разбудову сваей прамысловасьці. А цяпер—ведама ж — самі амэрыканскія капіталісты, улажыўшыя свае капіталы ў нямецкую прамысловасьць, заінтэрэсаваны ў тым, каб яна давала найвялікшыя зыскі... А дзеля гэтага—сама Амэрыка — націскам свайго капіталу на іншыя дзяржавы—здабывае для Нямеччыны патрэбныя для далейшага ўзросту нямецкай прамысловай сілы замежныя рынкі... Гэткім чынам—Нямеччына робіцца як быццам „эўрапэйскай філіяй“ („дачкой“—аддзелам, — як цяпер кажуць, „экспазітурай“) амэрыканскага капіталу“...

Сілу гэтага націску Амэрыкі на Польшчу лёгка ўгледзіць—у той даўнай, нячуванай дагэтуль у Польшчы,— уступлівасьці, з якой польскі ўрад ідзе на ўсе дамаганьні нямецкага ўраду—каб толькі — давясьці да памыснага скутку — „прадбачаны амэрыканскімі капіталістамі“—тарговы трактат з Нямеччынай.

Апошняя тэлеграма кажа, што Польшча — пасьля паразуменьня ў „палітычных варунках“ трактату — згадзілася ўжо і на апошняе чыста гаспадарчае трэбаваньне з боку нямецкага ўраду — на так званую „валярызацыю мытаў“, ці аблічэньне іх у залатых злотых.

Гэтую „лагоднасьць ды пагоднасьць“ адносна да Нямеччыны асабліва заманіфэставаў польскі міністар загран. спраў Залескі—ў сваей апошняй вялікай палітычнай прамове экспозэ — на банкеце „Таварыства дасьледчыкаў Міжнародавых справаў“ у Варшаве.

Калі параўнаваць, што казаў, як амаль не пагражаў Нямеччыне той самы міністар Залескі каля году назад у сваім экспозэ ў Сойме, дык цяперашняя яго прамова выдаецца папросту—„цудоўнай“...

Выбарная хроніка.

Перадчасная пацеха...

Кансалідацыя польскіх буржуазных сілаў пад штандарам м. Пілсудскага ўрастае— як цьвердзіць польская буржуазная прэса. З гэтых вывадаў яна вельмі цешыцца.

І сапраўды, што да польскай правіцы— дык урадавы кірунак Пілсудскага карыстаецца вялікім пасьпехам. У Пазнаншчыне і на Памор'ю стварылася каталіцка-нацыянальная гаспадарчая ўнія, у якую ўвайшлі кансэрватысты (манархісты) цэхі рамесьнікаў, мяшчанская сярэдняя кляса і Саюз „Маладая Польшча“. Унія гэта хоча абаперціся на супрацоўніцтва з урадам Пілсудскага. Такім чынам эндэцыя асталася ў Пазнаншчыне асірацелай і, відаць, вялікага пасьпеху мець ня будзе.

У каранной Польшчы і ў Заходняй Галіцыі правіца, што стаіць ў апазіцыі да ўраду Пілсудскага, разьбілася на два лягеры: „Польскі Каталіцкі блёк“, які склалі Пяст і Хадэцыя і Каталіцка — нацыянальны Камітэт—з эндэцыі.

У Вільні трэба спадзявацца, што эндэцыя і хадэцыя пойдуць разам і пэўне-ж будуць мець папулярнасьць сярод віленскіх дэвотак. Затое, трэба думаць, што ў іншых акругах на нашых землях хадэцыя і эндэцыя ня будуць выстаўляць сваіх сьпіскаў, уступаючы месца іншым польскім сьпіскам з пад сьцягу Пілсудскага, бо баяцца нападкаў усіх палякоў за разьбіваньне адзінага польскага фронту на так небясьпечным мейсцы, як нашы землі, дзе 90% складаюць беларусы.

Тры цікавыя вывады вынікаюць са склаўшайся перадвыбарнай сітуацыі ў Польшчы:

1. Урад Пілсудскага кансалідуе ўсе сілы і з правіцы і з лявіцы, якія толькі могуць з ім даразумецца—пачынаючы манархістамі і канчаючы некаторымі „сацыялістычнымі“ адламамі. Кансалідацыя гэта робіцца або ўцягваньнем розных груніровак ад манархістаў да „сацыялістаў“ у „Беспартыйны блёк супрацоўніцтва з ўрадам“, або паразуменьнем з рознымі палітычнымі групіроўкамі, захоўваючы іх імя і самастойнасьць працы, шляхам забясьпечаньня падтрыманьня ўраду Пілсудскага. Кампраміс часамі ідзе навет так далёка, што „Беспартыйны блёк супрацоўніцтва з урадам“ уступае месца гэтым групіроўкам, абы толькі не разьбіваць галасоў. Так у Пазнаншчыне „Беспартыйны блёк супрацоўніцтва з урадам уступіў месца „Каталіцка-нацыянальнай гаспадарчай уніі“.

2. Разьбівае ўсе проці - ўрадавыя партыі, як толькі можа і дзе толькі можа. У Пазнаншчыне, як мы бачылі, эндэцыя засталася адасобленай, дзякуючы ўступкам Каталіцка-нацыян. уніі, а на нашых землях тая-ж эндэцыя засталася выпертай на аснаве чыста польска нацыянальных мамэнтаў.

3. Стараецца захаваць за ўсякую цану еднасьць ў Заходняй Беларусі і ў Усходняй Галіцыі. Гэтага прынцыпу трымаюцца навет правыя польскія партыі, апазіцыйна настроеныя да ўраду Пілсудскага. Тут, бачыце, малыя надзеі на значны лік галасоў на польска буржуазныя сьпіскі. Дык разьбівацца ня прыходзіцца. Затое з вялікай радасьцю вітае, падтрымоўвае ды стварае разьбіцьце ды дэзар'ентацыю ў лягеры працоўным польскай буржуазіі. Яна вельмі цешыцца, што ў беларусаў паўстала каля 10 розных палітычных угрупаваньняў, бо спадзяецца, што галасы беларускіх працоўных масаў разаб'юцца на 10 роўных частак і тады яена, на чым баку выйгрыш. Частку-б скарыстала польская буржуазія з агульнага разьбіцьця, частку б—атрымалі „бёлорусы“ і „białorusini“ і толькі невялікую частку заправдны сьпісак беларускіх сялянска работн. масаў. Але польская прэса вельмі памыляецца, бо шмат каго пераацэньвае і шмат каго не дацэнівае. Яна верыць у тое, што „паважную“ колькасьць галасоў атрымае банкрот Паўлюкевіч і панок Умястоўскі і думае, што такія здраднікі беларускага працоўнага люду, як Ярэміч і Рагуля разам з хрысьцонымі праваслаўнымі і каталікамі зда будуць нешта. Навет спадзяецца, што й чарнасоценцы ў асобе Р. Н. О. знойдуць сабе прыхільнікаў.

Ну, але калі будаваць такія надзеі, дык можна прысьці да вываду, што Беларускі працоўны люд і ня думае праводзіць у Сойм сваіх прадстаўнікоў.

Толькі—не забывайце панкі з польскае прэсы, што Беларускі працоўны народ вырас у працягу апошніх некалькіх год у вялікага, сьвядомага нацыянальна і сацыяльна гіганта-волата, які скіне ўсякіх прыблудаў, спэкулянтаў і здраднікаў, як непатрэбную гніль з свайго здаровага маладога аргазізму і, аддаючы голас за свой сьпісак працоўных — выбярэ адпавядаючы яму лік сапраўдных сваіх прадстаўнікоў-абаронцаў, а ўсе разна бої, аб якім так мараць розныя панкі і паўпанкі, пойдуць міма яго, не зачапляючы яго навет.

Невядома таксама, што яшчэ будзе з польскай лявіцай. Тая-ж польская буржуазная прэса цешыцца з разьбіцьця сярод п. лявіцы, але толькі выбары пакажуць, за кім ідзе польскі працоўны люд.

Дык перадчасная пацеха польскай буржуазіі скарэй за ўсё разьвеецца, як вяснавы туман, разам з вынікамі выбараў.

Але дзеля гэтага неабходна актыўнасьць і кансолідацыя пры выбарах працоўных мас, трэба каб кожны працоўны галасаваў за сваю лісту, на якой будуць выстаўлены вядомыя барацьбіты за яго лепшую долю. Трэба, каб самі выбаршчыкі ўмелі з'арыентавацца і не разьбівалі сваіх галасоў надарма.

Тады ня страшны будуць нам пагрозы консолідацыі ў буржуазным лягеры, а пацехі розных панкоў акажуцца прадчаснымі.

Новыя дзяржаўныя сьпіскі.

З чародных нумароў дзяржаўных сьпіскаў кандыдатаў на пасолў ужо паданы: № 7, зложаны N. P. R. (народная работніцкая партыя), № 8 „Сільроб“ (Украінскі сялянска-работніцкі саюз). Нумар 9 выкідаецца згодна з Ордынацыяй выбарчай, каб ня зьмешываць 9 з 6. № 10 атрымала „Stronnictwo Chłopskie“.

Ліцытацыя мандатаў у блёку меншасьцяў.

У свой час мы пісалі, што ў блёку меншасьцяў жыды пастанавілі, каб кожны кандыдат на пасла ўнёс 3000 зл. на справу выбараў. Дык да гэтага часу знайшлося 14 кандыдатаў, якія згаджаюцца ўнясьці навет па 6000 зл. Трэба спадзявацца, што пры напльіве кандыдатаў цана на мандаты ў блёку меншасьцяў яшчэ павысіцца.

P. P. S. закідае ўжо сваю сець у Вільні.

У суботу 14/I ППС чуць не закідалі ўсю Вільню сваімі агітацыйнымі літкамі, прызываючы на мітынг, які меў адбыцца ў нядзелю ў кіно „Гэліос“. Банкрутуючая ППС шукае сабе прыхільнікаў навет у Вільні, але-ж вядома, якую здрадніцкую лінію ў адносінах да працоўных яна вяла ў мінулым Сойме. Дык, мусіць, ня ўдасца абдурыць пэпэсам віленскіх работнікаў.

Адв. С. Міцкевіч яшчэ раз хоча папрабаваць.

Пры выбарах у 1922 г. Адв. Міцкевіч выступаў са сваім асобным сьпіскам „Адраджэньне“. Акцыя не ўдалася, мандату Міцкевіч не атрымаў. Цяпер хоча спрабаваць другі раз свайго шчасьця, бо зноў выступае пад штандарам „Адраджэньне“.

У блёку меншасьцяў жыды не задаволены Ярэмічам і ня хочуць яму больш даваць грошы.

Справа ў тым, што Ярэміч спадзяваўся і на грошы жыдоўскай буржуазіі, і як піша віленская прэса, першая частка грошы былі выплачаны Ярэмічу. Але жыдоўская буржуазія глядзіць на рэчы рэальна: далі грошы, але-ж трэба паглядзець, каго Ярэміч мае за плячыма. І вось на сельсаюзьніцкім зьездзе Ярэміч хацеў паказаць сілу, на якую ён апіраецца. Зьезд вышаў няўдалы. Скандалы, грамадаўскія настроі... і іншыя рэчы не спадабаліся жыдоўскай буржуазіі. Яны ацанілі Ярэміча з яго ўплывамі і прышлі да вываду, што тавар ня пэўны. А раз так — дык купляць такога тавару ня варта, сказалі сабе, і не далі больш грошы. Кажуць, што Ярэміч дастаў вялікіх „згрызот“ з гэтай прычыны, галава яму баліць увесь час, навет кампрэсы не памагаюць і што надта ён пахудзеў пасьля гэтага.

Расейскія чарнасоценцы з Р. Н. О. адракліся выступаць у Віленскім вокрузе.

Відаць, няўдалы мітынг у салі Крэнгеля паказаў ім сапраўдную орыентацыю. Трэба спадзявацца, што і ў іншых акругах лёс іх вызначыць такі самы шлях.

Ну і кумпанія!

Старшыня жыдоўскае гміны ў Беластоку п. А. Тыкцін перадаў прадстаўнікам беспартыйнага блёку супрацоўніцтва з урадам, што да гэтага блёку далучаюцца жыдоўскія ортодоксы, Агуда і саюз уласьнікаў, ці лепей сказаць, камянічнікі.

Туды ім і дарога...

І яны спадзяюцца.

У Берасьці 11 і 12 студзеня адбылося паседжаньне Галоўнае Рады Рускага Народнага Аб'яднаньня, на якім ухвалілі выставіць у Сойм і Сэнат свой расейскі сьпісак у надзеі, што за яго будуць галасаваць ня толькі расейцы, але навет... беларусы і ўкраінцы.

Ну што ж, няхай спадзяюцца: надзея— матка дурных.

Абшарнікі падтрымоўваюць урад марш. Пілсудскага.

16 студзеня адбыўся зьезд абшарнікаў крэсовых, на якім яны ўхвалілі далучыцца да беспартыйнага блёку супрацоўніцтва з урадам, калі блёк гэты выставіць абшарніцкія кандыдатуры ў Віленскім, Лідзкім і Сьвянцянскім выбарных вокругах.

Камуністычны мітынг у Кракаве.

15 гэтага студзеня ў Кракаве адбыўся мітынг лявіцы ППС, Польскай Камуністычнай Партыі і Саюзу Камуністычнай Моладзі. Пад час прамоваў лявіцовых аратараў ППС згоднікі перашкаджалі ім гаварыць, калі-ж, ня гледзячы на гэта, мітынг цягнуўся далей, зачата бойка, у выніку якое 22 асобы на мітынгу былі арыштаваны.

Як відаць, партыя ППС вельмі добра сябе чуе пад аховаю паліцэйскіх мундуроў.

Не пашэньціла.

У Лідзіне 14/I. адбыўся зьезд дэлегатаў „mężów zaufania“ Вызваленцаў Влацлаўскага выбарнага вокругу, з удзелам б. пасла Лыпацэвіча, які дамагаўся, каб яго выставілі на лісту першым кандыдатам, але зьезд адкінуў гэтую прапазіцыю і ня прышоў ні да якіх вынікаў.

Бедны п. Лыпацэвіч чэша цяпер сваю бедную галоўку.

Ня могуць пагадзіцца.

14/I. у Любартаве адбыўся зьезд Вызваленцаў Любартаўскага выбарнага вокругу дзеля выбару кандыдатаў. Але з прычыны таго, што ў паслы з вызваленцаў палезла так шмат канкуруючых паміж сабою кандыдатаў, бо аж 15 асоб на першае мейсца, зьезд скончыўся нічым.

Веча „rozbijacza“ і голас сялян.

У нядзелю 15 гэтага студзеня ў Вільні адбыўся зьезд быўшага вызваленца, потым быўшага сябры Незалежнай Партыі Хлопскай, а цяпер сябры Радыкальнай Партыі Заходняе Беларусі, а і быўшага пасла наагул быўшага чалавека Шапеля.

Як і патрэбна на зьезьдзе „rozbijacza“— туды былі заклікаымы паны і зацягнены сяляне. Паны паставілі на чарод дня высылку тэлеграмы Пілсудскаму, сяляне—прапазіцыю аб стварэньні камісіі для паразуменьня з арганізацыямі працоўных. Каб ашукаць сялян і падмануць іх на пасылку тэлеграмы— камісія была створана. Але... але Н.П.Х-скі Сабалеўскі пашоў паразумявацца... з буржуазіяй, а з працоўнымі—адмовіўся.

Сяляне, якія ўвайшлі ў камісію, бачучы, што іх кругом абдурылі паны і іх наймiт, зложылі да нашае „рэдакцыі „Oświadczenie“, якое друкуем, як яно падана у польскай мове:

OSWIADCZENIE

Członków Komisji Porozumiewawczej i Członków Zarządu Głównego Radykalnej Partji Włościańskiej Zachodniej Białorusi:

„Podpisani członkowie Komisji Poroz. i członkowie zarządu R. P. W. Z. B. stwierdzają, że b. poseł Antoni Szapiel członek Komisji Porozumiewawczej pogwałcił wolę Zjazdu z dnia 15/I—1928 r. Albowiem nie zwołując posiedzenie Komisji, na własną rękę wchodzi w układy z innemi partjami, wrogiemi dla interesów chłopskich.

Podpisani potępiają zdradziecką robotę Szapiela, wzywając członków Zjazdu i członków partji do wyrażenia Szapielowi pogardy i do mocnego skupienia się przy nas do walki wyborczej przeciw burżuazji i ugodzie.

Podpisy:
(—) Konstanty Gołubowski
(—) Piotr Hojduk
członk. Komisji Porozum.
(—) A. Rusiecki
członek Zarządu.

Wilno, d. 17/I. 1928 r.

Гэткім чынам з 5 сяброў гэтае камісіі, выбранай на зьезьдзе, 3 — або абсалютная большасьць падпісалася пад гэтай заявай.

Падаючы гэта да ведама, рэдакцыя пэўная, што ўсе сяляне і работнікі, якія ашуканчым спосабам былі зацягнены на зьезд, з такой-жа пагардай аднясуцца да панскага грамілы, як і іх выбраньнікі.

Няхай жыве еднасьць працоўных!

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Вялізарнай важнасьці рэформы—шляхам дэкрэту...

Газэты паведамляюць, што ў тых днях мае быць выданы дэкрэт у справе вялізарнай важнасьці адміністрацыйных рэформаў у Рэспубліцы. Дэкрэт мае — перагледзець адміністрацыйны падзел Польшчы на ваяводзтвы, паветы, гміны;—правясьці „аб'яднаньне“ (зн. зах.) адміністрац. уладаў і таксама— прадбачаную Канстытуцыяй дэцэнтралізацыю ўладаў—побач з стварэньнем асобных адміністрацыйна судовых установаў — для кантролю законнасьці паступаньня адміністрацыі.

Праўда, у Канстытуцыі прадбачана яшчэ і тое, што—усё гэта павінен і мае права зрабіць толькі Сойм...

Суд над камуністамі.

Люблінскі Акружны Суд за прыналежнасьць да К.П.П. па I ч. 102 арт. прыгаварыў Зыгмунта Туркоўскага на 2 гады, а Боруха Кохмана на 4 гады катаргі. Кохман спаткаў прыгавар словамі: „Няхай жыве камунізм, прэч з фашызмам“.

Заграніцай.

Работнікі ССРР далі пазыку ў паўмільёна рублёў англійскім вугляконам.

У пачатку новага году Цэнтральны Камітэт Прафэс. Саюзаў ССРР перавёў праз англійскія банкі паўмільёна рублёў, як пазыку англійскім гарнякам.

Радавы ўрад таксама мае—апублікаваць дакументы аб англійскай агентуры ў Кітаі.

Камісарыят заграчічных спраў заявіў, што у хуткім часе мае апублікаваць рад дакументаў, якія сцьвярджаюць, што ўвесь сучасны проці-радавы рух у Кітаі арганізаваны на англійскія грошы. Дакументы падаюць цэлы сьпісак кітайскіх генералаў, якія знаходзяцца стала—„на службе і на пэнсыі“ англійскага ўраду. Радавы ўрад падасьць точныя лічбы атрымліваных пэнсыяў.

Англійская дывэрсыя на Каўказе.

Як ведама, пасьля паразуменьня паміж турэцкім і англійскім ўрадамі ў справе Мосульскай нафты, адносіны між Турцыяй і

Радамі значна папсаваліся. Дык англійская агентура мае магчымасьць з значнай вольнасьцяй працаваць на шкоду ССРР на радава-турэцкай граніцы. З Масквы пішуць, што ў Закаўказьзі страшэнна павялічыўся—сярод так-званых „адзэйрбэйджанцаў“ (каўказкіх туркаў, ці „татараў“-мусульман)—проці-радавы рух, страшэнна павялічылася проці-радавая прапаганда.

Удоўж усяго прыгранічча раскідаюцца праклямацыі, якія прадказываюць хуткі канец бальшавіцкай улады, чым заклікаюць скарыстаць—дзеля адарваньня ўсяго Каўказу ад ССРР і — далучэньня яго да Турцыі... Ясна, што тутака працуе англійская рука, якая хоча адцягнуць сюды ўвагу радавага ўраду, скіраваную, здаецца, пільна на англійскую Індыю.

Радава-францускія стасункі.

Як цьвердзяць маскоўскія карэспандэнты заграічных газэтаў, радавы ўрад пастанавіў рашуча—скрануць з мёртвага пункту замершыя свае стасункі з Францыяй. Дзеля гэтага радавы ўрад сьпешна апрацоўвае праграму новых перагавораў з Францыяй, якія мае асабіста распачаць новы пасол ССРР у Парыжу Доўгалеўскі. Як толькі праграма будзе апрацавана, зараз-жа пасол паедзе на свае месца. Радавы ўрад придае ў сучасны мамэнт асаблівую важнасьць канчальнаму паразуменьню з Францыяй. Адпак-жа ізноў на перашкодзе стаіць, як стаяла, — справа перадваенных даўгоў царскага ўраду, якія, як ведама, прынцыпова ануляваны расейскай рэвалюцыяй...

Трэба думаць, што радавы ўрад неяк пачакае—новых выбараў у Францыі, якія могуць даць больш згаворлівы ўрад... А датаго-ж—і... перагляду „пляну Доўса“ (ў справе оплаты адшкадаваньняў), які значна зьменшыўшы ўплыў нямецкага золата ў францускія касы, таксама павінен зрабіць больш уступлівым францускі ўрад, — якому яшчэ больш, як цяпер, патрэбны будуць радавыя грошы...

У справе зьмены канстытуцыі ў Літве.

Як ведама, Вальдэмарас хоча шпаркім тэмпам правясьці важныя зьмены ў літоўскай канстытуцыі — ў модным цяпер у ва усіх фашызаваных дзяржавах — напрамку „манархізацыі выканаўчай улады“, ці прасьцей—улады прэзыдэнта.

Але, каб зрабіць гэтую непапулярную ў дэмакратычнай Літве рэформу, Вальдэмарас у свой праект пераробкі канстытуцыі ўключыў і вельмі папулярны лёзунг—Вільні, як сталіцы Літвы. — Гэткі параграф мае быць уведзены ў новую канстытуцыю, якую трэба будзе—у часе народнага галасаваньня—прыс няць, або адкінуць цалком... Вальдэмара-абмысьліў усё вельмі хітра: ведама ж літоўскі народ—не адкіне канстытуцыі, дзе сказана, што Вільня, — гэта — сталіца Літвы... А знаныць побач з гэтым праскочыць у канстытуцыю і... манархізацыя прэзыдэнцкай улады ў зьвязку з маючымі распачацца перагаворамі з Польшчай. — Вальдэмарас хоча сьпешна прапхнуць праект новай канстытуцыі... Але ўсе партыі—проці гэтага праекту. Дык „усенароднае галасаваньне“ можа даць непажаданыя вынікі...

Тады ў Вальдэнараса зьявілася думка — „прапхнуць“ канстытуцыю шляхам дэкрэту... Але-ж тады, з другога боку, канстытуцыя, а з ёй і параграф аб Вільні — ня будуць мець такой сілы народнага выяўленьня волі, як патрэбны Вальдэмарасу — для яго палітычнай ігры з Польшчай...

Апошняя тэлеграма кажа, быццам Вальдэмарас ізноў заявіў, што новая канстытуцыя мае быць хутка праведзена і — шляхам усенароднага галасаваньня... Ці гэта значыць, што ён дабіўся паразуменьня з апазіцыяй, ня ведама.

Новыя пляны амэрыканскага марскога міністра ў справе — разбудовы амэрыканскага флёту.

Сэкрэтар па марскім справам Вільбур прадставіў марской камісіі парляманту новы праект разбудовы амэрыканскага ваеннага флёту. Праект прадбачыць будову — у працягу бліжэйшых 5 гадоў 25 вялікіх крэйсэраў навейшага тыпу, 32 падводных лодак, 9 контр-мінаносак і 5 плываючых „партоў для аэрапляваў“. Усё гэта — разам з існуючымі ўжо 8 вялікшымі крэйсэрамі і 10 меншымі — створыць крэйсэрскую эскадру Злучаных Штатаў сілаю ў 43 навейшага тыпу баявых адзінак.

Міністар заявіў, што зрэалізаваньне гэтай праграмы —, канешна з пагляду на патрэбу аховы замежнага гандлю Штатаў.

Новыя марскія збраеньні, дадаў (сьмяючыся ў кулак:..) амэрыканскі міністар, зусім не супярэчаць пастановам Вашынгтонскай Канфэрэнцыі (ў справе... абмяжаваньня збраеньняў на моры), а дзеля таго — ніхто (чытай: Англія) ня можа закінуць Злучаным Штатам, быццам яны будуюць крэйсэры —для зраўнаньня сваіх марскіх збраеньняў з іншымі дзяржавамі (чытай: Англіяй), або—можа—перавышэньня гэтых сілаў.

Праўда — Вашынгтонская Канфэрэнцыя пастанавіла абавязковыя лічбы — толькі для браняносцаў, а справа крэйсэраў была адложана тады напасьля і разглядалася каля трох месяцаў на Жэнэўскай Канфэрэнцыі, якая была сарвана Англіяй. Англія тады не згадзілася, каб адносна да крэйсэраў устанавіць тую-ж самую роўнасьць з Амэрыкай, якая была прынята ў Вашынгтоне адносна да браняносцаў. На гэтую ўмову Англіі цяпер і адказывае Амэрыка, за якой—няўгнацца значна зглеўшай Англіі.

Распачацьце польска-нямецкіх перагавораў у Варшаве.

13 студзеня прыбыла ў Варшаву нямецкая дэлегацыя — для перагавораў у справе заключэньня гандлёвай умовы. На чале дэлегацыі стаіць, як ведама — мін. Гэрмэс...

Як ведама, Гэрмэс, гэта быў у старажытных грэкаў „бог гандлю“. Дык, відаць—з боку ды на карысьць немцаў запраўды-ж будзе ўкладаць гаспадарчыя яе стасункі з Польшчай—сам бог прамысловасьці і гандлю.

Францускі дэлегат у Лізе Нацыяў згаджаецца на скасаваньне акупацыі ў Надрэніі.

Дэлегат Францыі ў Лізе Нацыяў Поль-Бонкур заявіў журналістам, што трэба прызнаць справядлівым звальненьне Надрэніі ад акупацыі. Але замест гэтага Нямеччына павінна згадзіцца на якуюсь іншую гарантыю на карысьць бясьпечнасьці Францыі. Такой гарантыяй мог бы быць — міжнародавы кантроль адэмілітарызаванага (ачышчанага ад усяго ваеннага: войскаў, крэпасьцяў, складаў аружжа і г. д.) абшару ўдоўж Рэйну. Кантроль быў-бы арганізаваны Лігай Нацыяў. Немцы павінны згадзіцца на гэта — бо-ж і самі нямецкія дэлегаты прымалі б учасьце ў кантрольнай камісіі.

У кожным разе — характэрная азнака часу.—Той самы „ўрадавы сацыяліст“ Поль Бонкур, які яшчэ ўлетку — поруч з бэльгійскім міністрам граміў немцаў за „збраеньні“ дый трэбаваў асаблівага над імі нагляду, цяпер згаджаецца“ на скасаваньне акупацыі.

Недарма ж — амаль ня ўся француская прэса—у сваіх навагодніх аглядах — прадбачыла скасаваньне акупацыі—ужо ў гэтым — новым годзе...

Далейшы развал Паулюкевічаушчыны.

(Арышт грамадзяніна М. Пятровіча).

Гэтымі днямі зьявілася заметка ў віленскай прэсе аб арышце Мацея Пятровіча, які нядаўна на шпальтах нашае газэты выкрыў усю паднагогтную брудную работы Паўлюкевіча. Паводле дадзеных з польскае прэсы, Пятровіч арыштаваны за тое, што ён утрымліваў зносіны з Масквой і з зьліквідаванай Грамадой. Далей гаворыцца, што Пятровіч меў перакупіць (sic!) сэкрэтара Паўлюкевічаўскай Беларускай Нацыянальнай Рады за 5.000 зл. п. (Вось дык штукі! Ніхто з беларусаў мусіць і ня ведаў, што ў Паўлюкевіча водзяцца такія цэннасьці! Ну проста гумарыстычна.—Р э д.). І на аснове гэтага Пятровіч арыштаваны і пасаджаны на Лукішкі.

Аб прычыне арышту Пятровіча шмат гаварыць ня прыходзіцца, факт арышту яго гаворыць сам за сябе, тым больш, што факт гэты стаўся зараз-жа пасьля таго, як Пятровіч апублікаваў сваю дэклярацыю.

Але разгледзім жменю фактаў аб Пятровічу з яго асабістага жыцьця, яны нам яшчэ шмат чаго скажуць.

Факты гэтыя можна было спаткаць яшчэ раней у польскай віленскай прэсе і навет у бруковым Паўлюкевічаўскім Беларускім Слове.

Калісь Пятровіч працаваў у вызваленцаў. Але, угледзіўшы, як ён кажа ў сваей дэклярацыі, шкоднасьць для беларусаў іх работы, ён вышаў з „Вызваленьня“. Далей чуем, што яму рабіліся закіды, што быццам ён працаваў у Грамадзе. Закіды гэтыя давялі да таго, што Пятровіч быў арыштаваны і нейкі час сядзеў. Паўлюкевіч разам з Варнікоўскім неяк адкапалі Пятровіча і аказаліся па столькі ўплывовымі, што навет вызвалілі яго з вастрогу. На якіх варунках быў вызвалены з вастрогу Пятровіч, нам невядома. Факт той толькі, што шансы Пятровіча пад Паўлюкевічавай апекай пачалі ўсё больш і больш узрастаць і дайшлі да таго, што пры выбарах у самаўрады Пятровіч быў выбарны войтам у Палачанскай гміне.

Да гэтага трэба дадаць, што па выхадзе з вастрогу Пятровіч стаўся галоўнай апорай Паўлюкевічаўшчыны. Ен быў: Віцэ-старшынёй Цэнтральнага Камітэту Беларускай Нацыянальнай Рады і Партыі, паўнамоцнікам—інструктарам Беларускага Т-ва Прасьвета на паветы: Маладэчанскі, Валожынскі і Ашмянскі, паўнамоцнікам — інструктарам Цэнтральнага Нацыянальнага Выбарнага Камітэту, сябрам камітэту па справах самаўрадаў і старшынёй першага зьезду гмінных радных-беларусаў у Вільні. Адным словам, Пятровіч быў асновай усіх паўлюкевічавых арганізацыяў і да гэтага яшчэ войтам Палачанскае воласьці.

У старостве Пятровіч карыстаўся дрэннай апініяй, стараста яго два разы не зацьвярджаў на становішча войта. Але і тут усемагутны Паўлюкевіч памог. Справа пайшла да ваяводы, які і зрабіў націск на старасту, каб зацьвярдзіць Пятровіча на становішча войта ў Палачанскай воласьці. Але ўсе гэтыя гонары і чыны, відаць, ня цешылі Пятровіча, ён адчуў сваей чыста-сялянскай натурай, якое зло ён прыносіць Беларускаму Народу, працуючы разам з Паўлюкевічам, тым болей што меў магчымасьць пазнаць, у чым заключаецца Паўлюкевічава „праца“. Над ёй мы тут спыняцца ня будзем, яна асьветлена добра ў дэклярацыі самага Пятровіча.

Факт той, што Пятровіч зрабіў вялікую ўслугу для Беларускага Народу, адчыняючы яму Паўлюкевіча і паказываючы ўвесь бруд і смурод з яе.

Зараз-жа пасьля гэтага Пятровіча арыштавалі.

Далей няма чаго казаць, усё ясна і зразумела.

Можна падкрэсьліць толькі, што арышт Пятровіча нічога Паўлюкевічу не памог, а толькі пашкодзіў, ён яшчэ дапоўніў дэклярацыю Пятровіча.

Дык ясна, што арышт гэны зьяўляецца далейшым развалам Паўлюкевічаўшчыны.

Пісьмы у Рэдакцыю.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Ветліва просім зьмясьціць у вашай газэце „Думка Працы“, наступнае:

Мы ніжэй падпісаныя, бышыя сябры Таварыства „Прасьвета“ і Беларускай Нацыянальнай Рады, (т. е. арганізацыі Паўлюкевіча, пераканаліся, што гэтыя арганізацыі ня ёсьць арганізацыі працоўнага люду, каторыя-б баранілі і змагаліся за лепшую будучыню і каторыя б баранілі нашы інтарэсы.

А цяпер добра зразумелі, што Т-ва „Прасьвета“ і Белар. Нацыянальная Партыя ёсьць арганізацыі абшарніцкія, і Паўлюкевіч— найміт панскі, і хоча ашукаць вёску за панскія грошы, бо дзе-ж бы ён узяў столькі грошаў, каб наняць сабе агентаў, якія езьдзяць па вёсках, як Гарбун з нашай ваколіцы, каторы пад рознымі хітрасьцямі заманваў нас запісацца ў Т-ва „Прасьветы“ і Белар. Нац. Рады. Мы добра зразумелі, што Гарбун за кожнага, хто толькі запішацца ў Т-ва „Прасьвета“ праз яго ласку, — бярэ грошы і, як Юда — проста прадае людзей у вочах усіх працоўных.

Заклікаем усіх чэсных грамадзян зрабіць гэта самае: выступіць з партыі і ўсіх арганізацыяў Паўлюкевіча.

Пры гэтым далучаем свае білеты за нумарамі: 176, 175, 172 і 180.

З пашанай: Уладзімер Пухоўскі, Міхаіл Хрышчановіч, Юльян Хрышчановіч і В. Хрышчановіч.

в. Гезгалы, Бяліцкай вол., Лідзкага пав.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Прашу не адмовіць надрукаваць у Вашай газэце „Думка Працы“ наступнае:

Спачуваючы роднай беларускай культуры і асьвеце, мы, моладзь в. Морач, Заастравецкае гміны, калі прыехаў да нас п. Шыбут і сваімі салодкімі славамі нас затуманіў, (ведама, што кожнаму цяпер хочацца сьвету), запісаліся да „Прасьветы“, як да культурнае і асьветнае ўстановы, добра не разабраўшыся, што робім вялікую памылку. Ажно нарэшце высьвятлілася, што пад відам „Прасьветы“ нас уцягваюць у сваю, нам ня мілую, палітыку. Цяпер нам стала ясна, што гэта за „Прасьвета“ і я, як бышы старшыня і ўсе сябры Аддзелу выступілі з гэтае „Прасьветы“, тым ліквідуючы Аддзел „Прасьветы“, як нам не патрэбную шкодную і ня мілую. На другі раз будзем асьцярожны.

Іншыя газэты прашу перадрукаваць.

З пашанай: Рыгор Рудко,

У рэдакцыю надыйшла адозва гэткага зьместу:

Браты Беларусы!

Я — старшыня Паўлюкевічаўскага гуртка „Прасьветы“ ў Баранавічах на рынку, за ўвесь час існаваньня гэтае „Прасьветы“ прыйшоў да моцнага пераканаўня, што ўсе Паўлюкевічавы арганізацыі існуюць на фальшывых нагах, каб уцягіваць на нейкі час усё новых і новых асоб, карыстаць з іх, бэсьціць усіх Беларусаў, а потым зноў шукаць новых і новых ахвяр дзеля сваей грашовай нягоднай працы, ад каторай Беларускі Народ можа мець столькі карысьці, сколькі ад казла малака. Затым усе тыны, што згуртаваліся каля Паўлюкевіча, ведаюць толькі адно: піць гарэлку і ўсіх і ўсё Беларускае паганіць.

Паўлюкевіч, як ведама, чарпае грошы з цёмных крыніц і за гэтыя грошы хоча крквавым потам Бел. Народу прайсьці ў Сойм, каб стаць паважнейшым, бо яму грошы даюць, але рукі не падаюць.

Я пераканаўся, што Паўлюкевіч і ўся ягоная бліжэйшая кумпанія — гэта заядлыя расейцы манархісты, нічога ня маючы супольнага з Беларускаю Думкаю, а Шыбут, Конан, Абрамчык і інш., што сядзяць цяпер у „Прасьвеце“ ў Баранавічах, — гэта проста правакатары.

Дык Беларусы, у каго яшчэ асталося хоць крыху сумленьня, павінны парваць усе свае зносіны з арганізацыямі Паўлюкевіча, а яго самога, дзе-б ён не паявіўся, належыць гнаць ад сябе, як дакучлівую, нахальна—злую муху.

І ўсіх грамадзян, каторых несьвядома я ўцягнуў у „Прасьвету“, думаючы, што гэта ўзапраўднасьці беларуская прасьветная ўстанова, вельмі гэтым перапрашаю і тых, каторых яшчэ можа асталіся сябрамі „Прасьветы“, заклікаю пайсьці за маім прыкладам, пакуль яшчэ ня позна, бо ўсіх Вас спаткае вялікае расчараваньне і няпрыемнасьць ад паўлюкевічаўцаў...

У гэтым самі пераканаецеся,—за што я не хачу нясьці адказнасьці.

Здраднік-здраднікам назаўсёды і застанецца! Няма яму мейсца сярод Белар. Народу!

Янка Шулейка.

Ад Рэдакцыі: Зьмяшчаючы гэтую адозву, якая ўва многім дае запраўдную характэрыстыку шулерскай банды — Рэдакцыя засьцерагае, што падпісаўшы гэтую адозву ня мае нічога супольнага з рухам працоўных беларускіх гушчаў, а, як відаць, ідзе з новай нам ня ведамай камбінацыяй Міткевіча, аб якім будзе далей. Падаем гэта да ведама, як цікавае зьявішча поўнага распаду Паўлюкевічаўскае банды.

Рэдакцыя мае яшчэ пісьмо Янкі Башаркевіча, у якім ён, адкідаючы закіды карэспандэнта нашае газэты, аб працы з Паўлюкевічам, заяўляе, што „не прадаваў сумленьня на прошлых выбарах, што не прадасьць і на гэтых за юдашавыя грошы“.

Такім чынам, нашае глыбокае пераканаўне, што ніхто з сялян ня йшоў з арганізацыямі Паўлюкевіча шчыра — апраўдываюцца ў поўнай меры. Вітаем гэтыя шагі сьвядомасьці беларускіх працоўных гушчаў.

Да сонца!

Ідзём мы сьмелаю ступой,
Ідзём, ідзём бясконца,
Шматмільённай грамадой
Ідзём туды...—да сонца!..
У цемры век душылі нас
Бяздушныя тыраны,
Але настаў і іншы час —
І мы адчулі раны.
Даволі! Годзе! Уперад, гэй!
Ніхто нас ня стрымае!
Ліецца песьня хай мацней,
Аб волі нам сьпявае!
Ня страшны нам ні кайданы
Ня страшныя нам краты —
Мы моц! Усё здалеем мы,
Нас ня стрымаюць баты.
Рукою—хоць у мазалях —
Мы скрушым перашкоды
І прасячэм шырокі шлях
Да шчасьця ўсіх народаў.
Наперад грудзі! Усьцяж ідзем,
Ідзём удаль бясконца!
Мы долю лепшую куем.
Хутчэй, браты!—Да сонца!

Я.

Ваенная рэформа ў Ірляндыі.

Ірляндзкі ўрад унёс у парлямант праект—рашучых зьменаў у лічбе і арганізацыі краёвай арміі. Армію пастаноўлена зьменшыць да мінімуму (найменшай лічбы) — ў 4.000 жаўнераў.

Чынная служба ў войску будзе трываць толькі 1—3 месяцы; пабыт у рэзэрве—6 гадоў — у веку ад 18 да 34. Рэшта патрэбнай для падтыманьня парадку ў краі, арміі будзе рэкрутавацца з ахвотнікаў—у мясцовыя вайсковыя фармацыі, у якіх будзе ўсяго—ня больш, як 12.000 жаўнераў. Гэткім чынам значна зьменшацца кошты ўтрыманьня арміі, а іменна — з 2 мільён. фунтаў (10 мільёнаў долараў) — да паўтара мільёна. Шчасьлівы край, які—дзякуючы свайму палажэньню на востраве і сваей мірнай палітыцы—можа не перашкаджаць сваім грамадзянам—займацца прадукцыйнай працай.

Дэманстрацыйныя—проці-англійскія — маніфэстацыі ў чэсьць афганскага эміра ў Індыі.

Як ведома, афганскі эмір (кароль) з сям'ёй выехаў з краю—у падарожу навакол сьвету—сябе паказаць ды на людзей паглядзець. Едучы ў Эўропу, дзе ён цяпер аглядае яе цуды ды дзівы, эмір Аман-Улла заехаў у Індыю. І вось—дзіўная рэч—яго праезд праз усю Індыю—да самага Бомбэю—ператварыўся ў адну суцэльную дэманстрацыю індыйскага нацыяналізму, скіраваную проці ўлады англійскіх захватчыкаў. Нязьлічаны сьцяг розных нацыянальных—індускіх і магамэтанскіх — арганізацыяў захоплена віталі афганскага караля, як галаву вольнага (ад чужземнага—англійскага—іга) народа... Адказываючы на гэтыя прывітаньні, афганскі кароль казаў—аб роўнасьці ўсіх народаў, аб іх праве на самаазначэньне і вольнае гаспадараваньне сваім лёсам, аб неабходнасьці — злучэньне ўсіх народаў у адзіную сям'ю, а— у частцы — злучэньне Індыі з Афганістанам, які ўжо здабыў сабе волю і незалежнасьць... У некаторых мэстах маніфэстацыі зьбіралі да паўмільёна людзей...

Цікаўна, што і тутака, як мы ўжо адзначалі, — індусы злучыліся ў адно з сваімі нядаўнымі сьмяротнымі ворагамі (нацкаванымі англійскай правакацыяй) — магамэтанамі.

Англійскі віцэ-кароль—„з прычыны хваробы“ — усьцяж быў адсутным у часе ўсіх гэтых урачыстасьцяў, якія гэткім чынам былі—чыста народнымі. Тое-ж рабілі — раптам „захварэўчыя“ ўсе прадстаўнікі англійскіх уладаў у Індыі. Толькі ў Бомбэі англійскі губэрнатар прыняў учасьце — у пажагнальным банкеце ў чэсьць караля — радуючыся, відаць, што — пазбыліся нарэшце непажаданага госьця.

Прэса адзначае, што афганскі кароль зьдзівіў усіх—сьмеласьцяй і шчырым дэмакратычным зьместам сваіх прамоваў, кажучы паўсюдых—аб неабходнасьці—шырокіх дэмакратычных рэформаў на карысьць масаў працоўнага народу...

Недарма, відаць, прайшоў ён школу ў сябе ў краі, у якім ўсьцяж крыжуюцца ўплывы — радавыя з англійскімі...

Дыпляматычны шантаж і бандытызм фашыстаўскіх павадыроў.

Да чаго абнаглелі італьянскія фашысты ў стасунку да амаль не стэрарызаванай Мусоліні Францыі, даводзяць заявы, зробленыя адным з павадыроў фашызму—аднэй з найбольш папулярных францускіх газэтаў.

Гэты бліжэйшы таварыш Мусоліні заявіў—ня больш—ня менш, што—калі Францыя хоча, каб Італія... загарантавала бясьпечнасьць Францыі, тады яна павінна—аддаць пад выключныя ўплывы (чытай: захват) тыя каляніяльныя абшары на Усходзе Сярэдземнага мора Сірыю, якую Францыя „атрымала“ ад... Лігі Нацыяў — „пад мандат“, дый дзе Францыя ўжо распараджаецца — зусім, як у сябе дома... Тады Італія абяцае... падарыць Францыі свой саюз, які будзе гарантаваць Францыю — ад нападу з боку Нямеччыны...

Трэба дадаць, што зусім нядаўна Італія паразумелася цалкам з Нямеччынай, якой таксама — за пэўныя рэчы — загарантавала падтрыманьне — проці Францыі, а перад-усім — у справе скасаваньня акупацыі, якая ў значнай меры дзеля гэтага рашуча скранута з мейсца...

Нямецкая прэса слушна называе гэтыя шантажна бандыцкія „прапазіцыі" італьянскага фашызму — сэнсацыяй, дадаючы, што такія прапазіцыі найвыдатнейшага фашыста зроблены бяз сумліву — з даручэньня самага Мусоліні.

У справе перагавораў паміж Польшчай і Літвой. Польская нота Коўне ў справе перагавораў.

Пасьля ведамай нам „гутаркі" Вальдэмараса з прадстаўніком „ПАТ"-а, у якой літоўскі прэм'ер заявіў, што ён — „чакае пачыну з польскага боку" — польскі ўрад выслаў у Коўну ноту, у справе гэтых перагавораў. У ноце польскі ўрад прапануе — распачаць перагаворы ў канцы студзеня. З свайго боку польскі ўрад высоўвае абшырную праграму перагавораў.

Праграма гэта прадбачыць — і ўзнаўленьне вольнага празгранічнага руху, і адбудову нармальнай чыгункавай, паштова-тэлеграфнай і таварнай камунікацыі — паміж Літвой і Віленшчынай — і шмат чаго яшчэ.

Як ведама, Вальдэмарас у сваей гутарцы заявіў, што можа згадзіцца на „тэхнічныя стасункі" паміж Літвой і Польшчай, але, не залічаючы да Польшчы Віленшчыну; ніякай беспасрэдняй камунікацыі між Літвой і Віленшчынай літоўскі ўрад прынцыпова дапусьціць ня можа...

Цяпер „Дзен. Віл." даносіць, быццам на апошнім паседжаньні літоўскага ўраду, склікавым з прычыны польскай ноты, пастаноўлена — на дамаганьне польскага ўраду адносна справы граніц і ўзнаўленьня праз-гранічнага руху адказаць катэгарычнай адмовай: сучасную „граніцу" між Літвой і Віленшчынай літоўскі ўрад усьцяж лічыць толькі „дэмаркацыйнай лініяй"... Дык гэты п. І. польскай ноты—ня можа навет быць устаўлены ў праграму перагавораў.

Што датычыць да іншых пунктаў польскай праграмы перагавораў — аб транзыце, і рознага роду камунікацыі, дык гэтыя справы могуць быць абгавораны на канфэрэнцыі.

Як ведама, ноту польскую павёз у Коўну спэцыяльны дэлегат мін. замежн. спраў, які і прывязе адказную ноту з Коўны.

Недахоп у вугальнай прамысловасьці Англіі.

Англійская статыстыка сьцьвярджае, што ў трэйцім квартале мінулага году англійскія вугальныя прамыслоўцы, здабыўшы ўсяго 58 мільёнаў тоннаў вугальля, страцілі на ім 3 мільёны фунтаў, ці 15 мільёнаў даляраў. Гэта, як ведама, тлумачыцца тым, што, — страціўшы за час 7-месячнай забастоўкі вуглякопаў у 1926 г.—шмат рынкаў, англійскія вугальныя прамыслоўцы цяпер павінны — таннымі цэнамі свайго вугальля, — выцясьняць з гэтых рынкаў сваіх канкурэнтаў...

Новая перамога францускага ўраду — над канстытуцыяй.

Францускі ўрад, які, як ведама, складаецца ў большасьці з радыкалаў і радыкалаў-сацыялістаў, а ўменшасьці — з „нацыяналістаў", увёс у парлямант „напамінаньне" аб тым, што ён мае арыштаваць 5 камуністычных паслоў — за іх „процідзяржаўную прапаганду ў войску" і інш.

Як ведама, дагэтуль правая палова ўраду не дамагалася—пад упльівам левай — гэтых арыштаў. Але цяпер, відаць, Пуанкарэ і Барту пачуліся сільнейшымі.

Сацыялісты патрэбавалі, каб у справе гэтых арыштаў была цалкам выканана працэдура, прадбачаная канстытуцыяй, якая трэбуе, каб увёс у парлямант — фармальнае жаданьне спыненьня канстытуцыйнай нятыкальнасьці гэтых паслоў—з дакладнымі матывамі. Аднак-жа мін. унутр. спраў Барту заявіў, што ўрад —бярэ на сябе ўсю адказнасьць за арышт дый ставіць гэтую справу— як справу даверыя да сябе з боку парляманту. Гэта значыць, што інакш урад выйдзе ў адстаўку.

Сьпярша „радыкальныя" міністры ўраду лічыліся з магчымасьцяй правалу ў парляманьце трэбаваньня ўраду і рыхтаваліся да адстаўкі... Але-ж галасаваньне паказала, што шмат радыкалаў падалі галасы за дазвол арыштаваньня дэпутатаў—з гвалтам над канстытуцыяй. Навет з паслоў — „радыкал-сацыялістаў"—42 галасавала за ўрад, 33 — проці, але аж 47 устрымалася ад голасу, — стварыўшы гэткім чынам—большасьць у 310 галасоў проці 229—за дамаганьне ўраду.

Гэткім чынам францускі парлямант „у даразным парадку" дазволіў ураду арыштаваць „нятыкальных" паслоў.

2 з іх—ведамы Кашэн і Вайян-Кутыр'е' ужо сядзяць, а 3—хаваюцца ад паліцыі.

Наша хроніка.

„Няпрошаныя госьці". У кватэру Цэнтральнага Выбарчага Камітэту ў ноч з 19-га на 20-га студзеня забраліся якіясь цікаўныя госьці, якія адамкнулі і ізноў замкнулі дзьверы і перарылі ўсе паперы Камітэту, відаць, чагось шукаючы (ці не „камуністычнай бібулы"?). Госьці хацелі і сьлед за сабою замесьці, але не ўдалося. Нейкім чынам яны разьбілі лямпу і шкла ня купілі новага (пэўна-ж было позна). Што гэта зрабілі ня мышы — відна з таго, што ўсе дробныя аскалкі былі пільна сабраны і вынесены. Здрадзіў „госьцей" толькі адзін вялікі аскалак, якога яны, як таго слана, відаць, не заўважылі.

Спэктакль-вечарына. Новасьвецкі Гурток Т-ва Белар. Школы 21-га студзеня ладзіць спэктакль-вечарыну ў памешканьні Галоўнае Управы Т-ва Белар. Школы (вул. Сьв. Ганны 2—3) гдзе будзе адыграна дзьве п'есы: 1) „Чорт у бочцы"—дзея ў 1-м акце, пераклад з украінскага; 2) „Хоць раз яго праўда"—дзея ў 2-х актах, пераклад з украінскага. Чынны ўдзел ў гульне прымуць наступныя асабы: 1) Эма Залкінд, 2) грам. Сіняўскі, 3) Люба Леванава, 4) А. Тарасаў, 5) А. Іваноўскі, 6) А. Смолік, 7) А. Шыктараў—пад кіраўніцтвам А. Мітрафанава.

Спэктакль-вечарына. У суботу 14-га студзеня Новасьвецкім Гуртком Т-ва Белар. Школы пастаўлен быў спэктакль, на якім пад кіраўніцтвам А. Мітрафанава згуляна п'еса Ф. Аляхновіча — „Птушка шчасьця". Артысты — Эма Залкінд, Аляксандар Іваноўскі і Аляксандар Смолік справіліся з сваімі ролямі вельмі ўдала. Трупа Новасьвецкага Гуртка ўсё што-раз болей заваёўвае сымпатыі работніцкай публікі.

Беларуская тэатральная трупа Галоўнае Управы Т-ва Беларускае Школы—карыстаецца вялікім пасьпехам на правінцыі. Выехала яна ў Слонімскі і Беластоцкі паветы, дзе спатыкаюць яе з захопленьнем. Трупа працуе пад кіраўніцтвам артыста Міхалевіча. Дала яна ўжо шмат спэктакляў. Справаздачу аб працы дамо пазьней.

Лекцыя. У мінулую нядзелю ў памешканьні Народнага Дому пры Галоўнай Управе Т-ва Беларускае Школы адбылася лекцыя гр. Макара Касьцевіча на тэму: „Трагэдыя беларускае інтэлігэнцыі". Лекцыя сабрала шмат слухачоў. На жаль, агульнае ўражаньне, якое засталося ад лекцыі, было сапсована танцулькай, якая распачалася пасьля лекцыі. Думаецца, што на другі раз арганізатары, а імі зьяўляецца Беларускі Студэнцкі Саюз у Вільні, пастараюцца ўхіліць гэту недарэчнасьць.

Зацьверджаньне канфіскаты. Акружны Суд у Вільні на паседжаньні 4./I. 1928 г. зацьвердзіў арышт, наложаны на аднадзёўку „Новагодняя Праца".

Ахвяры палітычным вязьням. Сябрамі Гуртка Т-ва Белар. Школы ў вёсцы Азіраўцы, сабрана (ў тэй-жа вёсцы і ваколіцы) і адаслана ў Лукішскую турму палітычным вязьням — 40 фун. хлеба, 12 фун. слаціны, 4 фун. мяса і 5 зл. 75 грошы.

Ад Рэдакцыі. Шчыра вітаем гэты шаг сьвядомых сялян!

27-га студзеня с. г. у м. Слоніме выязной сэсіяй Гарадзенскага Акружнога Суда, будзе разглядацца справа з арт. 102 К. К. аб прыналежнасьці да Камуністычнай Партыі Зах. Беларусі. М. Агушэвіча, Я. Агушэвіча, Емельянчыка Лаўрына, Кавалеўскага Хвёдара, Гарасіка Дзям'яна, Крупніка, Бахрака, Троцкіа. Усе вышэйпаданыя абвінавачаныя сядзяць ужо па 2 гады ў Слонімскім вастрозе.

7-га лютага с. г. у м. Беластоку будзе разглядацца справа 132 асоб, абвінавачаных з арт. 51 і 102 К. К. у сувязі з арт. 100 ч. I К. К. г. з. у прыналежнасьці да Камун. Партыі Зах. Беларусі. Усе гэтыя арыштаваныя асобы, як відаць з акту абвінавачаньня, які абыймае больш 300 старонак друку, тварылі Цэнтральны Камітэт К.П.З.Б., Беластоцкі Акр. Кам. К.П.З.Б. 1 раённы камітэт, 7 падраённых і некалькі ячэяк. Двох з гэтых арыштаваных—Якуба Чэрніка і Станіслава Мэртэнса 3 студзеня с. г. абмянялі ў ССРР, з боку пракуратуры на расправу паклікана 186 сьведкаў, між імі знаходзіцца галоўны сьведка правакатар гэтага працэсу Міхах Гурын, працаўнік „Беларускага Дня".

Два дні адпачынку. Міністар Вызнаньняў рэлігійных і Асьветы выдаў загад, на моцы якога ў дзень першага лютага, як пераходны ад першага да другога паўгодзьдзя, усе вучні звальняюцца ад заняткаў у школе.

Рэдукцыя. Вядомы чытачом „Думкі Працы" панок Ф. Умястоўскі, як відаць, не атрымаў крэдытаў на вядзеньне свае шопкі, бо 16 гэтага студзеня зрэдукаваў сваіх працаўнікоў М. Косьцевіча, А. Бартуля і М. Тулейку. Ці не пачатак гэта канца гэтае авантурніцкае арганізацыі і партыі.

Узрост безработных. Кажуць, што справы ў Польшчы папраўляюцца, але безрабоцьце ўсьцяж расьце. А гэта вельмі дрэнны паказальнік. На першае студзеня 1928 г безработных было 164,800 а за тыдзень лік іх павялічыўся яшчэ на 4,360 асоб.

Правакацыйны жэст „Сялянскай Нівы". У апошнім нумары „Сялянскае Нівы" пад загалоўкам „І яшчэ раз" зьмешчаны артыкул, у якім прапануецца „Думцы Працы" прылучыцца да блёку меншасьцяў. У гэтым артыкуле выказваецца бруднае, фальшывае асьвятленьне справы Грамады і беларускіх паслоў, што стаялі на чале яе. І накідаючы гэныя бруды, „Сялянская Ніва" дазваляе сабе працягаваць свае брудныя рукі да „Думкі Працы". Вось да чаго можа дайсьці подласьць Ярэміча і Рагулі.

Відаць, яны ня маюць цьвёрдага грунту пад нагамі, відаць, іх прыхільнікі выстаўляюць ім канкрэтныя дамаганьні, дык, каб ад караскацца ад іх, яны выстаўляюць гэтыя дамаганьні ў такой бруднай форме, робячы жэст перад імі, якога мы інакш ня можам назваць, як правакацыйным. Мы разумеем дамаганьні сялян, якія, атуманеныя Ярэмічам і Рагуляй, усё ж такі разумеюць, куды папалі, і таму выстаўляюць канкрэтныя дамаганьні. Але-ж трэба ведаць, з кім маеш дачыненьне.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Сельсаюзьнікам ня шэньціць.

(Мір, Наваградзкага пав.).

Ня гледзячы на ўсю хлусьню павадыроў Сельсаюзу у сваёй газэцінце „Сялянская Ніва", што сілы іх растуць, праца павялічваецца і што толькі яны адны валадаюць настроямі вёскі, мушу сьцьвердзіць адваротнае. Што ўсе іх высілкі сплываюць нінавошта. Прывяду факт. Былы пасол і б. грамадавец Ю. Сабалеўскі ў нашым мястэчку расьпінаўся і даказваў, што тая лінія, якую ён праводзіць цяпер,—найлепшая (вядома дзеля яго кішані, але не дзеля народу). Раілі яму шчыра, па-суседзку пайсьці ізноў з тымі людзьмі, якіх ён кінуў (але там яго мусіць ня прымуць) або адыйсьці ад палітычнае працы і не баламуціць беларускае вёскі. Але ўсе гэтыя рады адбіліся ад яго, як гарох ад сьцяны, бо, як відаць, трудна адвыкаць ад пасольскіх дыэтаў, дармовых разьездаў, ну і, вядома, пашаны, якой карыстаўся і якую так любіць. Вось-жа пасьля нефартуннай канфэрэнцыі сельсаюзьнікаў п. Сабалеўскі прыслаў аднаму з нашых мірскіх хлопцаў цэлую пачку свае літэратуры, інструкцыяў, статутаў і інш., але ён, як верны сын свайго народу, як абаронца яго правоў, адаслаў яе назад пану Сабалеўскаму дзеля хатняга ўжытку. Пане Сабалеўскі! досыць вам ужо чмуціць наш народ. Ен ужо добра разгадаў вас, раскусіў вашу здрадніцкую палітыку і ні з вамі, ні з вашымі хаўрусьнікамі ня пойдзе, а калі яны пакажуцца сярод нас, то будзем гнаць іх ад сябе, як шалёных сабак. **Мірскі.**

Хто нашы шкоднікі.

(Вёска Урынё, Слонімскага павету).

Па ініцыятыве сьвядомейшых сяброў Угрынскага Гуртка Т-ва Бел. Школы рашылі паставіць на сьвята спэктакль. Знайшліся дзяўчата, хлопцы і думалі, што вось пойдзе ўсё, як па масьле; пойдзе ўся моладзь, а за ёю і старэйшыя, дык п'янству і лаянкам будзе капут. Але заўсёды дык знойдуцца такія асобы, якім асьвета чаму-сь коле ў вочы. Яшчэ было-бы звычайная рэч, каб гэтыя шкоднікі сьвятла на вёсцы былі якія шляхтуны, або панскія падлізы, але ўзялі гэтую агідную ролю свае хлопцы, якія рашуча сталі байкатаваць гэты першы шаг з цемры да сонца. Калі-ж гэтыя паночкі даведаліся, што была ўжо рэпэтыцыя, дык зараз-жа прыказалі не хадзіць на гэтую рэпэтыцыю, „а то галавы паадрываем і ніколі ня пусьцім на музыкі". Але дзяўчата, якія ня ўзіраюцца на дурныя пагрозы, не паслухалі і рэпэтыцыя йшла далей. Наскольні артысты рыхтаваліся да спэктаклю, настолькі гэтыя „бацькі" стараліся агітаваць проціў спэктакля. Атрымалі дазвол зрабіць спэктакль у паўшэхнай школе. Зрабілі сцэну, як трэба і чакалі, ня толькі артысты, але і мала што ня ўся вёска. Прыйшоў другі дзень Каляд і сталі сходзіцца людзі з свае́й, а таксама з ваколічных вёсак. Навет жыдоўская інтэлігенцыя прыехала з мястэчка Дзярэчына за 4-ры кілямэтры, спачуваючы гэтаму кроку. І што-ж мы бачым: жанатыя мужчыны папрыходзілі, а кавалеры радам робяць „музыкі", напіўшыся як тузы! Калі-ж некалькі дзяўчат прыйшлі на спэктакль, а потым пайшлі на музыкі, дык ад іх патрэбавалі па 2 злоты штрафу (ведама-ж на гарэлку для разумных кавалераў?), але за іх уступіўся адзін хлапец, які дэкляраваў за іх заплаціць.

Можа хто падумае, што яны ня ведалі, ў чым справа? Не, ім тлумачылі, што гэта значыць у вёсцы і наагул спэктакль і што ўвесь даход пойдзе на кніжкі для бібліятэкі-чытальні ў сваей-жа вёсцы, дык ня ведама, чаму гэта яны так па-асьлінаму апіраліся. Накэўна, што і самы яны ня ведаюць. Можа хто падумае, што гэта робяць якія блазны? Не, гэта робяць тыя, якія адслужылі ў войску. Для першага разу імёнаў іх поўнасьцю ня буду ставіць, а толькі па літарах, г. ё. Ал. Д., Вя. Т., Мік. Міс. і С. Д. Апошні з іх сказаў, „што мне гэты спэктакль, ня гэткія бачыў у войску. Мне найлепшы спэктакль з дзяўчынаю ў цёмным кутку".

Ганьба вам, хлопцы, ня толькі ад свае́й вёскі і Угрынскага Гуртка Т-ва Бел. Школы, але і ад усяе прабуджаючайся ад сну Бацькаўшчыны! Я прапанаваў бы ўсім вакалічным сябрам Т-ва Белар. Школы навучыць іх, бо думаю, што яны і самы не разумеюць сваіх шкодных паступкаў супроць вызваленчага руху.

Спэктакль быў адыграны, як выражаліся з вакалічных вёсак сьвядомыя інтэлігенты, надта добра. І сапраўды ўсе артысты выканалі свае ролі проста памастацку. Усе былі здаволеныя і з вялікаю падзякаю разышліся па дамох. Жыды навет шчыра запрашалі гэтыя рэчы адыграць у м-ку Дзярэчыне, у чым ім была дана згода, калі ня будзе перашкодаў. Пакуль што пастанавілі адыграць у в. Азёрках-Вялікіх, таксама па запрашэньню. **„Малады сябра".**

Адозвы.

7-га студзеня г. году былі высланы на зьезд у Лідзе, скліканы пад фірмай Партыі Дробных Рамесьнікаў панам войтам гм. Хаценчыцкай Вялейскага павету Ігнат Грынкевіч з в. Лаўцэвічы, Д. Карповіч з в. Храмцава і асаднікі, якіх у нас ня мала. Адтуль імі прывезена і раздаецца шмат адозваў, надта добрага зьместу, з салодкімі абяцанкамі. Можа-б наіўны селянін і паверыў бы ім, каб ня было ў іх заклiку да еднасьці з тымі людзьмі, якім у сваіх рэзалюцыях складаюць даверра ды бачаць адзіны ратунак паны Зубры-Мачархісты. Ці-ж аднолькавыя імкненьні бедняка і манархіста?—кожны ведае.

Дык ганьба Вам, сяляне, што за смачныя абеды, якімі Вас трактавалі на зьезьдзе, распаўсюджываеце непатрэбныя нам адозвы, бо гэта ня нашая партыя, больш асаднікаў нам ня трэба. Аб іх яна толькі і руціцца, а не аб нас. **Тутэйшы.**

Наш самаўрад і асьвета.

На паседжаньні Косаўскае Гміннае Рады 2./I. 1928 г. на прапазіцыю Косаўскае Акружное Управы Т-ва Беларускае Школы разглядалася пытаньне аб дапамозе беларускім гімназіям і бібліятэкам-чытальням Т-ва Беларускае Школы. Зрабіць даклад па гэтым пытаньням Гмінная Рада дазволіла сэкрэтару Косаўскае Акружное Управы Т-ва Беларускае Школы п. Дыльку. Абрысаваўшы палажэньне і ролю ў жыцьці беларускага сялянства, як беларускіх гімназіяў, у якіх вучацца дзеці сялян і работнікаў, так і бібліятэк-чытальняў, грам. Дылька прапанаваў радным асыгнаваць на гэта пэўныя сумы. Аднак, калі прысутны на паседжаньні пан Косаўскі Стараста наперад заявіў сабраньню, што ён не зацьвердзіць пастановы—аб дапамозе беларускім гімназіям, то было аднагалосна ўсімі раднымі пастаноўлена асыгнаваць толькі на беларускія бібліятэкі-чытальні Т-ва Белар. Школы 200 зл. Грамадзяне радныя! Вы павінны былі-б споўніць да канца свой грамадзкі абавязак і вынесьці пастанову аб асыгнаваньні на беларускія гімназіі дапамогі, ня гледзячы на тое, што можа п. Староста зацьвердзіць, ці не вашу пастанову. Няхай ведае ўвесь культурны сьвет як адносяцца, браточкі радныя! — да вашых пастаноў і патрэбаў улады, якія заграніцай у Заходняй Эўропе кажуць усім, што нам, беларусам, жывецца, як у раю, што нам далі ўсё патрэбнае для нашага белар. культурна-асьветнага жыцьця. **Беларус радны.**

Водгукі Зьезду Т-ва Белар. Школы.

На вяртаючыхся з зьезду Т-ва Беларускае Школы ў Вільні 28 і 29 сьнежня 1927 году, косаўская дэфэнзыва зрабіла аблаву. Трымалі на Косаўскім паліцэйскім пастарунку 5 дэлегатаў ад Т-ва Белар. Школы, Косаўскага павету ажно цэлы дзень з ранку да вечара. Шукалі нелегальнай літэратуры.

Усе сьвядомыя людзі абураны такім яўным жаданьнем Косаўскае дэфэнзывы стэрарызаваць жыхарства і адбіць ахвоту да культурнае працы. **Вачавідзец.**

Памагаюць.

8./I. 1928 г. Косаўскае Т-ва Беларускае Школы ладзіла спэктакль, аб чым загадзя была падана просьба да Косаўскага старасты і атрыманы ўстны дазвол (бо ў нас пісьменнага дазволу стараста на рукі не дае́ць, а перасылае тэлефанічна на пастарунак паліцыі паведамленьне, што спэктакль дазволены і каб дзеля гэтага паліцыя не рабіла перашкод). Аднак, ня гледзячы на гэта, калі артысты пэўныя, што маюць права граць, пачалі толькі рабіць генаральную рэпэтыцыю і прадаваць білеты, то ўвайшоў п'яны паліцыянт п. Басэк і лаючы артыстаў бальшавікамі і камуністамі, выгнаў усіх з памешканьня тэатра. Прысутныя вельмі абурыліся на такое адносіньне да беларускае культурнае арганізацыі. Толькі, дзякуючы сьвядомасьці і рашучасьці сяброў Т-ва, удалося лабіцца ад Косаўскага старасты дазволу позным вечарам і спэктакль адбыўся такі ў той-жа вечар пры перапоўненай залі. На другі дзень так-жа адбыўся спэктакль. Глядзельнікаў была поўная заля. Спэктакль зрабіў на ўсіх прысутных добрае ўражаньне. Шкада толькі, што паперы нашых культурных беларускіх арганізацыяў нейк гінуць у ўрадавых установах у патрэбную пору, бо, як выясьнілася, просьба аб дазвол на пастаноўку спэктаклю, толькі на другі дзень знайшлася такі ў старостве. **Змагар.**

Паштовая скрынка.

В. Г. п. Пархвенава, в. Чэркасы. Напішыце поўнасьцю сваё імя і прозьвішча, а то ня ведаем, каму высылаць газэту. — **Яну Мартэну.** Просім падаць свой дакладны адрас. Календары адрыўныя ўжо распрадаліся. — **Аляксандру Піцько.** Адрыўных календароў ужо няма. Мож выслаць Вам календар-кніжку, каштуе 1 зл.—і што рабіць з другой залатоўкай. — **К. Сьветлавастокаву.** Дзівімся Вашай „працы". Вы пішаце пісьмо да рэдакцыяў радыкальных газэт з просьбай прысылаць газэту, выстаўляючы сябе прыхільнікам працоўнага народу, а поруч падаеце вясткі ў дэфэнзыўнае „Беларускае Слова" аб тым, што яны прысылаюцца Вам бяз просьбы. Няўжо Вы ня ведаеце, што Вы тут гуляеце ролю бруднага правакатара і даношчыка і што гэта кампрамітуе ў вачох працоўных масаў, толькі Вас. Пісьмо Ваша і дасюль знаходзіцца ў рэдакцыйным архіве. — **Сымону Быцку.** Пазбаўленьне Вас права галасаваньня Абвадовая Камісія магла абаперці на дзеякія пункты „выбарчай ардынацыі", якая, напрыклад, кажа: ня маюць права выбіраць: 1) „зусім ці часткова пазбаўленыя ўласнавольнасьці"... 3) „правамоцна ўкараныя пастановаю суда, калі аднаачасна пастаноўлена аддаць іх пад паліцэйскі надзор, ці ў дом працы ў часе трываньня надзору, ці пабыту ў доме працы, але ў кожным разе ня менш 3-х гадоў з дня правамоцнасьці ўстановы"... Прымаючы пад увагу Ваша палажэньне, камісія магла „тлумачыць" яго ў свой бок. Ну, і „вытлумачыла". Відаць—тут нічога ня зробіш.

Рэдактар-Выдавец: Міхалай Шымансі

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.